Акцыя

# АЎТААМАТАРЫ ЗА БЕЛАРУСЬ!

**У Мінскай вобласці прайшоў аўтапрабег у падтрымку міру, стабільнасці і спакою. За два дні — 5 і 6 верасня — яго ўдзельнікі пабывалі ў кожным раёне сталічнага рэгіёна, агульны маршрут аўтапрабегу склаў 1200 кіламетраў.**

Акцыя стала адной з самых маштабных сярод падобных у краіне, паведамілі ў Мінаблвыканкаме. Паўдзельнічаць у ёй вырашыла больш за 600 аўтааматараў з усіх раёнаў Міншчыны, больш за 1000 аўтамабіляў. Цікавы і фармат мерапрыемства: у кожным раёне аўтамабілісты перадавалі адно аднаму дзяржаўны сцяг.

Удзельнікі ўпрыгожылі свае аўтамабілі чырвона-зялёнымі стужкамі і дзяржаўнымі сцягамі нашай краіны. На ўрачыстым старце мерапрыемства ўдзельнічалі кіраўнікі вобласці, прадстаўнікі грамадскасці, моладзь. Аб сваім жаданні падтрымаць мір, стабільнасць і бяспеку ў краіне заявілі людзі розных узростаў, прафесій і захапленняў.



Пасля гэтага ад Кургана Славы стартавалі першыя 40 машын з жыхарамі Смалявіцкага раёна. Яны перадалі сцяг аўтааматарам з Жодзіна. Тыя, у сваю чаргу — кіроўцам у Барысаўскім раёне. Далей маршрут аўтапрабегу прайшоў праз 11 раёнаў вобласці, а фінішаваў увечары ў Капылі. На наступны дзень удзельнікі зноў адправіліся ў дарогу, каб пабываць у заходніх і паўночных рэгіёнах Міншчыны. Аўтааматары наведалі таксама мемарыяльны комплекс «Хатынь». Завяршыўся аўтапрабег у Мінскім раёне.

# ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ — НА РОВАРЫ

## Студэнты Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта адзначылі 18-ю гадавіну БРСМ велапрабегам па горадзе

**Упершыню падобная акцыя адбылася тры гады таму. Праз год ідэю падтрымалі. І вось 6 верасня, у дзень стварэння грамадскага маладзёжнага аб'яднання, прайшоў чарговы, чацвёрты па ліку велапрабег будучых спецыялістаў-аграрыяў.**

А каб мерапрыемства стала яшчэ і пазнавальным, старшакурснікі ВНУ прапанавалі зрабіць экскурс па гістарычных мясцінах горада. Яны выступілі ў якасці гідаў для першакурснікаў, многія з якіх прыехалі на вучобу з розных раёнаў вобласці.

Старт велапрабегу быў дадзены ад маладзёжнага цэнтра «Гродна». Далей маршрут пралягаў праз парк імя Жылібера, каля старажытнай лютэранскай кірхі, заапарка, Свята-Пакроўскага кафедральнага сабора, дома пісьменніцы Элізы Ажэшкі, драмтэатра, Старога і Новага замкаў, Вялікай харальнай сінагогі. Фінішавалі студэнты ў Каложскім парку, непадалёк ад знакамітай Каложскай царквы XII стагоддзя. Такім чынам удзельнікі велапрабегу не толькі даведаліся шмат пазнавальнага, але і з карысцю для здароўя правялі свой час. Па словах сакратара пярвічкі ГА «БРСМ»




www.grodnonews.by

аграрнага ўніверсітэта Вікторыі Бобніс, такія сумесныя акцыі садзейнічаюць яшчэ большай згуртаванасці студэнтаў, даюць імпульс для новых спраў і ўздымаюць настрой.

Дарэчы, гэтым разам прадстаўнікі аграрнага ўніверсітэта ўдзельнічалі ў велапрабегу не ўпершыню. У жніўні актывісты прафсаюза студэнтаў прынялі ўдзел у першым Гродзенскім абласным прафсаюзным велапрабегу «За Беларусь». Тады маршрут праходзіў па маляўнічых мясцінах Гродзенскага раёна.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Ініцыятыва

# КРЭАТЫЎ ВІТАЕЦЦА!

## З 7 верасня на Гродзеншчыне стартуе чэлендж3#ГоднаеРоднае

**Арганізатары яшчэ раз нагадаюць аб семантыцы дзяржаўнай сімволікі Беларусі. А далучыцца да праекта зможа кожны жыхар Гродзенскай вобласці. Як гэта зрабіць?**




Ідэя ў кожнага можа быць свая. Па словах галоўнага спецыяліста ўпраўлення культуры аблвыканкама Ірыны Жук-Куніцкай, спосабы самыя розныя. Хтосьці можа расказаць сваімі словамі, запісаць відэаролік, скласці верш, намаляваць карціну ці зрабіць фотаздымак. Крэатыў і разнастайнасць вітаюцца. Галоўнае, данесці свае адносіны да дзяржаўнага сцяга ў кантэксце яго палітры.

— Кожны грамадзянін павінен даражыць нацыянальнымі сімваламі дзяржавы, у якой жыве, ведаць іх семантыку. Калі чалавек разумее значэнне кожнага элемента і колеравай гамы дзяржаўных герба і сцяга, тады ён будзе больш асэнсавана іх успрымаць і ганарыцца гэтымі сімваламі, разумець, наколькі яны блізкія яго сэрцу, — кажа Ірына Жук-Куніцкая.

Па словах суразмоўніцы, гродзенцы сталі праяўляць інтарэс да новага праекта і дасылаць свае работы. Прыклад паказалі арганізатары — прадстаўнікі сістэмы адукацыі і культуры вобласці. Не засталіся ўбаку і бібліятэкары. У рамках чэленджа яны запускаюць свой падпраект #Сцягline. Дарэчы, па ініцыятыве чытачоў бібліятэкі імя Карскага. Умовы простыя: чытачы падбіраюць цытату з любой кнігі, якая адлюстроўвае іх погляд ці асацыяцыю з колерамі дзяржаўнага сцяга. Аўтарскія работы будуць размешчаны на сайце ўпраўлення культуры аблвыканкама і ў яго Telegram-канале.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Эканоміка

# Прамысловасць сталіцы працуе ў штатным рэжыме

**Усе буйныя прамысловыя прадпрыемствы, размешчаныя на тэрыторыі Мінска, працуюць. Пра гэта паведаміў падчас суботняй прамой лініі, якая прайшла 5 верасня, намеснік старшыні Мінгарвыканкама Юрый ТРУШЧАНКА.**

Па яго словах, эпідэміялагічная сітуацыя ўнесла некаторыя карэктывы ў работу шэрагу суб'ектаў гаспадарання. Але ў цэлым бізнес-клімат у сталіцы не пагоршыўся. Пра гэта сведчаць лічбы, паведаміла агенцтва «Мінск-Навіны».

У першым паўгоддзі 2019 года ў Мінску дзейнічалі 51 тысяча суб'ектаў гаспадарання. У бягучым паўгоддзі іх колькасць узрасла больш чым на тысячу. Павялічваецца і колькасць індывідуальных прадпрымальнікаў. Іх налічваецца больш за 81 тысячу. За год прырост склаў чатыры тысячы ІП. Акрамя таго, за першыя шэсць месяцаў 2020 года прыцягненне прамых замежных інвестыцый у Мінску склала 614 мільёнаў рублёў.

Юрый Трушчанка таксама адзначыў, што больш за 2,7 тысячы суб'ектаў гаспадарання скарысталіся падтрымкай, прадугледжанай Указам № 143 «Аб падтрымцы эканомікі». Мінгарвыканкам аказаў дапамогу, прадугледжаную указам, 2 759 суб'ектам гаспадарання. Прадпрыемствы атрымалі каля 32,2 мільёна рублёў. Суб'екты гаспадарання прадстаўляюць розныя сферы: прамысловасць, грамадскае харчаванне, турыстычны, гасцінічны бізнесы. І ў асноўным яны прыватнай формы ўласнасці. Ім былі аказаны ўсе віды дапамогі, у тым ліку зніжэнне стаўкі арэнднай платы, падатковы крэдыт, зніжэнне зямельнага і падатку на нерухомасць і іншае.

Адзначым, што сёння ў сталіцы функцыянуюць 52 тысячы суб'ектаў гаспадарання. Крыху больш за 5 % з іх скарысталіся падтрымкай, прадугледжанай Указам № 143.

Анонс

# Пошук родных адрасоў

**Тэма суайчыннікаў заўсёды мае свае актуаліі. Гісторыя папярэдніх дзесяцігоддзяў, савецкі перыяд часу, ды і ранейшыя стагоддзі накладвалі сваю пячатку на міграцыйныя працэсы. І беларусы, як высвятляецца, паўсюль былі запатрабаваныя. Таму і ўвага дзяржавы да стварэння гісторыі гэтых працэсаў — і дакументальнай, і мастацка-публіцыстычнай — выяўляецца заўсёды.**

Як прыклад — наступны праект. Выдавецкі дом «Звязда» выконвае падпраграму «Беларусы замежжа» Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі». У яе межах, пачынаючы з 2017 года, пабачылі свет некалькі тамоў у агульнай серыі «Адрасы Беларусі ў свеце».

Вось і сёлета пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства замежных спраў нашай краіны павінна выйсці кніга «Родны небасхіл у сэрцы» ў дзвюх частках. У першай будзе ісці расповед пра лёсы нашых суайчыннікаў у Расіі, пра тыя мясціны Расіі, якія так ці інакш звязаны з Беларуссю. Другая частка, другі том — пра беларускую повязь з краінамі Цэнтральнай Азіі — Казахстанам, Кыргызстанам, Туркменістанам, Таджыкістанам, Узбекістанам.

Чытача чакае сустрэча з лёсамі пісьменнікаў, археолагаў, падарожнікаў, вучоных розных спецыяльнасцяў, акцёраў, рэжысёраў, мастакоў, якія засведчылі сябе справамі ў розных старонках свету. Назавём імёны некаторых нашых суродзічаў, пра якіх расказваюць розныя аўтары, — Мікола Калінковіч, Міхась Карпенка, Зінаіда Марская, Мікіта Брылёў, Сяргей Юрэнеў...

**Сяргей ШЫЧКО.**

Надвор'е

# А раніцай — свежа

## Па начах чакаецца сур'ёзнае паніжэнне тэмпературы

**Вось і скончыўся першы тыдзень восені. Ён быў вельмі цёплы, калі сярэднясутачная тэмпература паветра на 2—5 градусаў перавышала кліматычную норму. А ў пачатку другой дэкады тэмпературны фон паступова будзе набліжацца да звычайных для гэтай пары года значэнняў у асноўным з-за паніжэння начных тэмператур. Гэта верасень бярэ кіраванне ў свае рукі, лічаць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень кароткачасовыя дажджы прагназуюцца пераважна на поўначы Беларусі, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра апынецца ў межах 15—20 градусаў цяпла. У сераду ўначы і раніцай пераважна па паўночнай палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, а ўдзень будзе ў асноўным без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы ад плюс 9 да 14 градусаў, удзень будзе адносна камфортна і 16—23 градусы са знакам плюс. Дастаткова вільготным будзе і чацвер. У гэты дзень, на большай частцы Беларусі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымыя навальніцы. Удзень месцамі вецер будзе ўзмацняцца парывамі да 15—20 м/с. У начныя гадзіны тэмпература паветра складзе 10—16 цяпла, а ўдзень будзе ад плюс 15 да 22 цяпла градусаў. Па паўднёвым усходзе краіны сонца будзе значна больш актыўнае, таму ўдзень паветра там прагрэецца да 23—26 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 4 да 10 градусаў, удзень — плюс 13—20. Дарэчы, да канца тыдня ў сувязі з ростам атмасфернага ціску дажджы павінны спыніцца. Але цяпло ўжо не вернецца...

**Сяргей КУРКАЧ.**